4. Miyoshi, K. The First Century of English Monolingua / K. Miyoshi. – Cambridge : Cambridge Scholars Publishing, 2017. – 180 s.
5. Svensén, B. Practical Lexicography / B. Svensén. – New York : Oxford University Press, 1993. – 285 p.
6. Żmigrodzki, P. Słowo − słownik − rzeczywistość / P. Żmigrodzki. − Kraków : Lexis, 2008. − 230 s.
7. Żmigrodzki, P. Wprowadzenie do leksykografii polskiej / P. Żmigrodzki. − Kraków : Wyd-wo Uniwersitetu Śląskiego, 2003. − 269 s.

811.161.3’367.633 + 811.161.3’366.54

К.Д. Ганчарэнка, ст. навук. супрац., канд. філал. навук
(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

## УЖЫВАННЕ КАНСТРУКЦЫЙ З ПРЫНАЗОЎНІКАМІ *АБ/ ПРА* Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ XXI ст.

У сучаснай практыцы ідзе паступовае адмаўленне ад выкарыстання канструкцыі *аб* + назоўнік з М. скл. пры абазначэнні аб’екта пачуццяў, тэмы гутаркі і яе замена на *пра* + В. скл. Варыятнасць ёсць і ў займеніках: *аб ёй/ пра яе*, *аб гэтым/ пра гэта*.
У першую чаргу змены датычацца асабовых назоўнікаў м. р. Так, спалучэнне *пра мужа* зафіксавана ў інтэрнэт-дыскурсе за 2010–2018 гг. больш за 80%, *аб мужу* – на даведачных, рэгіянальных сайтах і інш. *Адразу скажуць, жонка піша* ***пра мужа***. (zviazda.by, 25.02.2016). Адна з прычын пераходу да канструкцый з *пра* – больш складаная сістэма канчаткаў М. скл. у параўнанні з В. скл. У М. скл. у асабовых назоўнікаў м. р. з мяккай асновай, на *р, ц* і шыпячыя – розныя канчаткі з неасабовым назоўнікамі: *аб вучн**ю**/ кан**і***, *аб Мележ**у**/ Парыж**ы***. У школьных падручніках асноўным канчаткам для асабовых назоўнікаў м. р. з цвёрдай асновай быў *-у* (М.Ц. Кавалёва, 1991, 1995, Г.А. Гваздовіч і інш., 1999, 2004), *-е* як варыянтны: *аб сыну(-е)*. У апошнім падручніку (Г. М. Валочка і інш., 2016) асноўным стаў *-е*: *аб сыне, Коласе*. Форма з прыназоўнікам *пра* і В. скл., які мае канчаткі *-а* (*-я*), а з неадушаўлёнымі назоўнікамі – форму Н. скл. – больш аптымальная. *Ён унуку* ***пра Аляксандра*** *Македонскага чытаў* (Бярозка. № 2. 2018), *пра хлопца, пра мядведзя-выратавальніка, пра інцыдэнт*. Форма *пра* зручная і для назоўнікаў ж. р. на *г, к, х,* дзе ў М. скл. адбываецца змяненне ў аснове: ***Аб бяспецы*** *гаворым бесперапынна…* (minobl.mchs.gov.by, 31.10.2018) і *З малымі* ***пра бяспеку****!* (mogilev.mchs.gov.by, 24.01.2019).

У некаторых ўстойлівых канструкцыях *аб* захоўваецца: ***уяўленне аб*** *прафесіі журналіста;* ***аб*** *міры* ***малюся****, памятаюць аб ёй,* ***як аб*** *прафесіянале****.*** Звязаныя спалучэнні з *пра: чытаць* ***пра*** *сябе, ні за што ні* ***пра*** *што* (М. Канюшкевіч, Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі, 2008, Ч. 3). Тыповае спалучэнне *аб подзвігу* і *пра подзвіг* у інтэрнэт-дыскурсе за 2010–2019 гг. сустракаецца пароўну. *У 1974 годзе ў памяць* ***аб подзвігу*** *М. Дарашэвіча была ўстаноўлена мармуровая дошка* (nashkraj.by, 24.04.2016). *...****Пра подзвіг*** *герояў Брэсцкай крэпасці мы потым пісалі ў сачыненнях.* (lves.by, 25.01.2019).

Змяніліся і стылістычныя прыярытэты. У падручніках "Сучасная беларуская мова..." (БДПУ, 2017) і "Беларуская мова. Марфалогія" (БДУ, 2018) прыназоўнік *аб* аднесены да публіцыстычнага і навуковага стылю (*Загад аб адлічэнні*), калі сфера ўжывання прыназоўніка *пра* – больш шырокая: *меркаваць пра палітыку*. Г. У. Арашонкава і В. П. Лемцюгова пісалі, што прыназоўнікі *аб* і *пра* сінанімічныя, але прыназоўнік *аб* – кніжны, *пра* – гутарковы ("Кіраванне ў беларускай і рускай мовах", 1991). П. П. Шуба заўважаў, што з прыназоўнікам *аб* галоўным словам могуць быць назоўнікі тыпу *пагадненне*, *рашэнне, тэорыя*, залежным – часцей абстрактны назоўнік (*роздум аб лёсе*), а вось прыназоўнік *пра* ўтварае сувязь паміж дзеясловам і канкрэтным назоўнікам, хаця сама канструкцыя бліжэй да гутарковых ("Прыназоўнік у беларускай мове", 1971). Падыход сучасных лінгвістаў выключае прыназоўнік *аб* з іншых стыляў, акрамя афіцыйнага маўлення, а ў плане выбару нормы арыентуецца на гутарковае маўленне. Канструкцыі з *аб* часцей сустракаюцца ў тэкстах грамадска-палітычнай тэматыкі: *далажылі* ***аб*** *баявых магчымасцях*, *інфармаваць інвестараў* ***аб*** *умовах вядзення бізнесу,* у навуковым стылі: *замацоўваць веды* ***аб*** *прыметніках****,*** *паняцце* ***аб*** *простых ліках*. Канструкцыі з *пра* – у тэкстах на культурную, побытавую тэматыку: *легенда* ***пра*** *валун, распавяла* ***пра*** *маю прабабулю. Перадача* ***пра*** *матылькоў* (А. Горват).

Спрэчнай з'яўляецца думка, выказаная Ю. М. Бабічам са спасылкай на Ф. М. Янкоўскага, што словазлучэнні з прыназоўнікам *аб* у беларускай мове непажаданыя, штучныя, ужываюцца пад уплывам рускай мовы (Беларускае Падзвінне: зб. навук. арт.; Полацк, 2016). Канструкцыя *аб* + М. скл ёсць у вядомых аўтараў, якія паважаюцца пурыстамі, – у Б. Тарашкевіча (*аб ваўку*) і Я. Станкевіча (*аб вайводу, аб імені*), у беларускай літаратуры XIX–XX стст.: *Бывала, як хто* ***аб жонцы*** *спомне, што кінула...* (Ф. Багушэвіч); *Я не баюся, Косцік, — кажа ён* ***аб снезе***. (Я. Брыль). Ідэнтычныя формы характэрныя не толькі для рускай: *о саде, об учителе*, але і польскай: *o artyście, o lecie, o Wiśle*, чэшскай моў: *o řemeslnících* (мн.л.), *o tiži.*

Такім чынам, для будучай акадэмічнай граматыкі важна захаваць прыназоўнік *аб* у рэкамендацыйных табліцах (разам з *у, пры, на, па*) для адлюстравання поўнага пераліку магчымых словаформ. З улікам наяўнай практыкі можна даць заўвагу аб пераважным выкарыстанні канструкцый *аб* + М. скл. у афіцыйна-дзелавым, навуковым стылях.

УДК 811.161.3:81’367.332.1

І. У. Капцюг, дац., канд. філал. навук (ВА РБ, г. Мінск)

## ФУНКЦЫІ ЗВАРОТКА Ў МОВЕ МАСТАЦКІХ ТЭКСТАЎ

Пытанне функцый зваротка закранаецца многімі лінгвістамі і з’яўляецца адным з самых істотных пры даследаванні гэтай моўнай адзінкі. Тым не менш, на сённяшні дзень мовазнаўцы яшчэ не выпрацавалі адзінага погляду на функцыі зваротка ў мове: адны даследчыкі выдзяляюць толькі дзве функцыі, уласцівыя зваротку, іншыя адзначаюць функуцыянальную разнастайнасць зваротка.

Даследаванне, праведзенае на матэрыяле твораў мастацкай літаратуры, дазваляе вылучыць наступныя функцыі зваротка: намінатыўную, характарыстычна-эматыўную, мадальную, устанаўлення кантакту, падтрымання кантакту, завяршэння кантакту. Функцыі зваротка цесна звязаны паміж сабой, і ў шэрагу выпадкаў бывае цяжка адмежаваць адну функцыю ад другой.

Адрасат маўлення пры намінатыўнай функцыі зваротка выражаецца разнастайнымі лексічнымі сродкамі, выбар якіх звычайна дыферэнцыраваны жанрам тэксту. У празаічных творах дамінуюць звароткі, якія называюць асобу чалавека па імені, імені па бацьку, імені і імені па бацьку, прозвішчы, сваяцтве, узросце, роду заняткаў, званні, пасадзе і інш.: *Добры дзень, **Алёша**; Працуйце, **маэстра**.* У вершаваных творах дамінуюць звароткі, якія называюць птушак, жывёл, расліны, прадметы рэчаіснасці, абстрактныя паняцці і інш.: *Не кувай ты, **шэрая зязюля**, сумным гукам у бары; Няма, **ваўчок**, табе збавення!* Ужыванне лексічных сродкаў адрозніваецца таксама паводле граматычнай катэгорыі адушаўлёнасці / неадушаўлёнасці назоўнікаў. Звароткі, выражаныя адушаўлёнымі назоўнікамі, характэрныя для ўсіх літаратурных жанраў і складаюць 88,1% ад агульнай колькасці адабраных адзінак. Лексіка-семантычныя групы звароткаў, выражаных неадушаўлёнымі назоўнікамі, зафіксаваны, у асноўным, у паэтычных творах майстроў слова і складаюць 11,9% ад агульнай колькасці ілюстрацыйнага матэрыялу.

Характарыстычна-эматыўная функцыя выяўляецца ў здольнасці зваротка выступаць у якасці сродку характарыстыкі адрасата, а